ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 15 (849) ● Пятніца, 12 мая 1972 г. Год выдання XXV ● Цана 2 кап.

## ПЕРАД СЕСІЯЙ

Экзаменацыйная сесія — гэта праверка ведаў і навыкаў, ступені падрыхтаванасці студэнтаў. Неабходнасць яе відавочная, калі прыняць пад увагу, што кожнаму выпускніку універсітэта будзе даверана праца ў пэўнай галіне практычнай дзейнасці, якая патрабуе сістэматычных ведаў.

Першыя экзамены былі прадугледжаны універсітэцкімі статутамі яшчэ ў 1775 годзе. Цікава адзначыць, што ў той час яны называліся «истязаниями», але праводзіліся ўдумліва і гуманна. Выкладчыкам прадпісвалася «вопросы чинить велегласно, кратко и ясно: в чем же ответ кого будет неисправен, — поправлять ласково, дабы тем юность в наипущую конфузию не привесть».

У гэтых прадпісаннях быў вялікі педагагічны сэнс: яны ўказвалі на строгі праверачны характар экзаменаў, а тлумачэнне абавязвала праводзіць іх з вялікім педагагічным тактам і ўвагай да асаблівасцей юнацкага ўзросту.

У савецкай вышэйшай школе ўстаноўлены пэўныя прынцыпы і дакладная праверка ведаў і практычных навыкаў студэнтаў. Падрыхтоўка да экзаменаў і залікаў з'яўляецца арганічнай часткай навучальнага працэсу і дапамагае абагульніць і замацаваць веды, прывесці іх у строгую сістэму, а таксама ліквідаваць узнікшыя ў працэсе вучэбных заняткаў прабелы. Усім зразумела, што як бы ні была добра арганізавана вучэбная работа на працягу ўсяго навучальнага года, усё ж канец апошняга семестра і перыяд экзаменацыйнай сесіі — час напружанай работы для ўсіх студэнтаў. Узмоцненая работа студэнтаў перад канцом семестра дае падставы для размовы аб перагрузцы заняткамі. Ці для ўсіх студэнтаў! Канешне, не. Для тых, якія планамерна працавалі ў час семестра, перагрузкі не будзе. А хто працаваў мала, у таго, натуральна, будуць перагрузка, неспакойныя дні, бяссонныя ночы.

Трэба адзначыць, што на тых факультэтах, дзе навучальны працэс вызначаецца высокім ідэйным і навукова-тэарэтычным узроўнем, экзамены не з'яўляюцца праблемай. На працягу вучэбнага года тут усё падпарадкавана задачам планамернай вучэбнай работы.

Як вядома, у зімовую сесію значных поспехаў у павышэнні паспяховасці дабіліся факультэты: журналістыкі, юрыдычны, гістарычны, хімічны, геаграфічны, прыкладной матэматыкі. На гэтых факультэтах экзамены праводзяцца з вялікай клапатлівасцю ў адносінах да студэнтаў і ўсведамленнем адказнасці перад дзяржавай.

Вельмі важнай з'яўляецца правільная арганізацыя экзаменаў. Неабходна ўлічваць характар дысцыпліны, ступень яе складанасці, а таксама ўмовы, у якіх праходзілі заняткі (наколькі паспяхова пройдзен курс, наяўнасць падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў, як былі арганізаваны лабараторныя і практычныя заняткі, цяжкасці ў пастаноўцы курса, недахопы ў галіне выкладання). Усё гэта абавязвае дэканаў факультэтаў і загадчыкаў кафедр прааналізаваць падрыхтаванасць студэнтаў па кожнай дысцыпліне. перад экзаменамі арганізаваць чытанне аглядных лекцый, забяспечыць рэгулярныя кансультацыі.

Трывалай базай падрыхтоўкі студэнтаў да экзаменаў павінны служыць падручнікі і вучэбныя дапаможнікі, вызначаныя праграмай па кожнай дысцыпліне. Мы лічым памылковай арыентацыю студэнтаў некаторымі выкладчыкамі толькі на канспекты іх лекцый. Нельга згадзіцца са звычайнымі пры гэтым спасылкамі на тое, што падручнікі ўстарэлі або пабудаваны на недапушчальнай з іх пункту гледжання аснове. Канспект пры падрыхтоўцы да экзаменаў можа служыць першапачатковым, накіроўваючым або даведніцкім дапаможнікам у залежнасці ад яго якасці.

У час падрыхтоўкі да экзаменаў і ў працэсе саміх экзаменаў рэкамендуецца карыстацца вучэбнай праграмай. Па раду дысцыплін на экзаменах можна прымяняць наглядныя дапаможнікі. Кожная кафедра самастойна вырашае пытанне аб магчымасці выкарыстання даведніцкіх і наглядных дапаможнікаў. Студэнты загадзя апавяшчаюцца аб тым, якія наглядныя дапаможнікі і даведніцкія матэрыялы будуць ім даступны на экзаменах.

На кожнай кафедры неабходна вызначыць тыя агульныя бакі падрыхтоўкі, якія павінны быць у полі зроку экзаменатара і служыць вядомым арыенцірам пры ацэнцы ведаў студэнтаў (разуменне і ступень засваення тэорыі курса, метадалагічная падрыхтоўка, знаёмства з асноўнай літаратурай, уменне прыкласці тэорыю да практыкі, рашаць задачы).

Універсітэт дае студэнту сучасную навуковую падрыхтоўку і вучыць яго вучыцца, што дазволіць яму ў далейшым асвойваць навейшыя дасягненні навукі і тэхнікі, творча працаваць у выбранай галіне.

Дастойна правесці вясеннюю экзаменацыйную сесію—асноўная задача, якая стаіць перад універсітэтам напярэдадні ўсенароднага свята—50-годдзя ўтварэння СССР.

**В. ДАЛГАРУКАЎ,**
начальнік вучэбнага аддзела.

## Весткі з факультэтаў

### ПАДРЫХТОЎЧЫ

● Напярэдадні Дня Перамогі на падрыхтоўчым факультэце адбылася сустрэча студэнтаў з генерал-маёрам медыцынскай службы ў адстаўцы Цярэнціем Арцем'евічам Трэбко.

Ён расказаў замежным студэнтам аб мужнай барацьбе савецкага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны, падзяліўся ўспамінамі аб тых незабыўных і цяжкіх часінах, якія давялося перажыць, прывёў шмат цікавых і захапляючых эпізодаў з баявых аперацый у дні суровых выпрабаванняў.

Ц. А. Трэбко з глыбокай павагай успомніў студэнтаў і выкладчыкаў нашага універсітэта, якія загінулі ў бязлітаснай барацьбе за шчасце ўсіх людзей планеты. Расказаў аб тых супрацоўніках універсітэта і факультэта, якія абаранялі нашу Айчыну, а цяпер аддаюць усе свае веды і сілы выхаванню падрастаючага пакалення.

У заключэнне Ц. А. Трэбко сказаў:

— Няхай неба ва ўсім свеце заўсёды будзе чыстым!

Замежныя студэнты, стоячы, доўга віталі жаданага госця шчырымі апладысментамі. Потым паднеслі яму букеты жывых кветак і горача павіншавалі ў яго асобе савецкіх воінаў, увесь савецкі народ са святам вялікай Перамогі.

**В. КАЛАДЗІНСКІ.**

### ФІЗФАК

● Камандзіры студэнцкіх будаўнічых атрадаў «Аэліта», «Саната», «Спектр» В. Таранчук, В. Сізоў, А. Майонаў разам з камандзірамі другіх цалінных атрадаў універсітэта выехалі ў Чапаеўскі раён Уральскай вобласці. Яны пабываюць у будаўнічых арганізацыях і высветляць іх гатоўнасць да прыёму студэнцкіх атрадаў.

● Больш 120 першакурснікаў фізфака напярэдадні Дня Перамогі наведалі мемарыяльны комплекс Хатынь.

**Н. САЛУК.**

### ФІЛФАК

● Вось ужо каторы год філалагічны факультэт адпраўляе на будоўлі свае студэнцкія атрады. Сёлета тут сфарміраваны тры такія атрады: «Буравеснік-72», «Беларускі» і мінскі гарадскі.

Буравеснікаўцы маюць свае слаўныя традыцыі. У папярэднія гады яны займалі адно з першых месц у спаборніцтве сярод будаўнічых атрадаў, якія працавалі ў Беларусі. Касцяк атрада складаюць студэнты старэйшых курсаў, якія не ўпершыню ўдзельнічаюць у працоўным семестры.

У свабодны ад работы час студэнты будуць выступаць з лекцыямі і канцэртамі перад насельніцтвам. Сумаваць не прыйдзецца, бо «Буравесніку-72», як і атраду «Беларускі», прадстаіць шмат работы на беларускай «цаліне».

Створана таксама брыгада праваднiц. У склад яе ўваходзяць галоўным чынам студэнткі III і IV курсаў. Месца работы брыгады — Паўднёвая чыгунка. Ахвотнікаў было вельмі многа. Прыйшлося вытрымаць сапраўдны конкурс: патрабавалася 20 чалавек, а заяў —у тры разы больш.

У бліжэйшы час члены будаўнічых атрадаў пройдуць папярэднюю працоўную праверку на прадпрыемствах Мінска. Гэта дасць магчымасць яшчэ лепш пазнаць людзей, выявіць іх здольнасць да работы ў будаўнічых атрадах.

**А. МІСНІК.**





* Факультатыўную лекцыю для студэнтаў II курса фізфака чытае асістэнт кафедры тэарэтычнай фізікі М. М. ПОЛАЗАЎ.

* Адна з апошніх лекцый па палітэканоміі ў студэнтаў-выпускнікоў геаграфічнага факультэта. Чытае яе дацэнт кафедры палітэканоміі В. І. ЦАКУНОВА.

Фота Д. ЧАХОВІЧА.



## КІМ БЫЦЬ?

Перад сённяшнім дзесяцікласнікам адкрыты ўсе дзверы. Але што рабіць, калі ён не ведае, у якія з іх увайсці? Большасць юнакоў і дзяўчат зараз рашаюць амаль што гамлетаўскую праблему: «Быць або не быць?». А гэта ж, ох, як цяжка. І вельмі добра, што разумеюць гэта старэйшыя таварышы, людзі, у нашых вачах умудроныя жыццёвым вопытам, — студэнты. Нездарма яны ўсяляк спрабуюць дапамагчы выпускнікам школ правільна выбраць прафесію. З гэтай мэтай і праходзіў днямі ў БДУ «Фестываль ведаў».

...У актавай зале універсітэта непрывычна ціха, а сюды ж прыйшлі старшакласнікі з многіх мінскіх школ, і зала ну проста бітком набіта. Усе чамусьці хвалююцца, чакаюць, што ж будзе далей. Але вось на сцэну падымаецца сакратар камітэта камсамола БДУ, кандыдат гістарычных навук Алег Георгіевіч Слука. Ад тых цёплых і прыветлівых слоў, якія ён гаворыць, хваляванне адразу знікае, і рабяты пачынаюць адчуваць сябе нібы ў гасцях у старых добрых сяброў.

Многа адкрыццяў зрабілі мы для сябе ў дзень «Фестывалю ведаў». З выступленняў студэнтаў гістарычнага факультэта даведаліся, які слаўны шлях прайшоў універсітэт за 50 год. Пазнаёміліся з будучымі фізікамі і географамі, хімікамі і журналістамі, матэматыкамі, літаратуразнаўцамі, якія паказалі нам свае вучэбныя кабінеты і лабараторыі, цікава і захапляюча расказалі аб сваёй прафесіі. І мы пераканаліся, як многа патрэбна папрацаваць для таго, каб насіць ганаровае званне студэнта Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

Няма сумнення, што такая сустрэча школьнікаў з універсітэтам вельмі карысная. Тым, хто ўжо ведае, кім будзе, яна дапаможа ўмацаваць сваё рашэнне, а тым, хто вагаецца, нарэшце зрабіць выбар.

**Т. САЕВІЧ,**
вучаніца 10-га класа
СШ № 81.

# ГАЛОЎНАЕ — САМАСТОЙНАСЦЬ

У аўдыторыі № 419, як мне сказалі, ідуць звычайныя лабараторныя заняткі па фізічнай хіміі ў звычайнай групы.

...Вялікі светлы пакой з мноствам кветак і прыбораў. Адразу і не с к а ж а ш, чаго тут больш: кветак ці прыбораў.

Выкладчык Галіна Андрэеўна Лазерка вядзе заняткі з першай групай першага патока III курса.

— У гэтай лабараторыі, — гаворыць Г. А. Лазерка, — студэнты праводзяць даследаванні па электрахіміі. Усяго на лабараторны курс у нас адводзіцца 90 гадзін. Ён уключае яшчэ кінетыку і тэрмадынаміку. Кожны, хто атрымаў заданне, павінен здаць так званы допуск — тэарэтычны матэрыял па пэўнай тэме.

У гэты час да Галіны Андрэеўны падыходзіць хлопец. У руках сшытак з формуламі і графікам. Нешта не атрымліваецца ў вылічэннях. Цікава, што выкладчыца не імкнецца ўсё растлумачыць адразу, а ўважліва прасочвае ход думкі студэнта, асцярожна робіць некалькі заўваг, і вось ужо ўсё зразумела.

— Бачылі формулы? Гэта ўжо вынік работы з прыборамі: матэматычная і графічная апрацоўка. Вядома, бываюць памылкі. Тады робім праверку. І, наогул, існуе закон: памыліўся, знайдзі памылку, прааналізуй яе прычыну.

Што датычыцца групы, то яна сапраўды самая звычайная. Проста ў нас няма дзялення на слабых і моцных. Усе займаюцца добра. Інакш у хіміі нельга.

Аляксандр Яфімаў і Мікалай Донь-Шыпайка працуюць над тэмай «Вызначэнне лікаў пераносу».

На пытанне, што яны лічаць галоўным у сваёй рабоце, Саша адказаў:

— Галоўнае — рабіць усё самому, каб зразумець сутнасць. Мы ведаем, што гэта рабілі да нас і пасля нас будуць рабіць, але калі сваімі рукамі папрацуем, любыя цяжкія рэчы здаюцца простымі і яшчэ больш цікавымі.

Рабяты чакалі вынікаў вопыту. Было некалькі вольных хвілін, і мы разгаварыліся:

Ім падабаецца ўсё: лабараторыя, сённяшняя тэма работы, хімія. Няпраўда, быццам хімікі заняты з раніцы да вечара. Калі правільна размеркаваць час, яго хапае і на тэатр, і на кнігі. А што многа лабараторных, дык гэта ж здорава! Па-першае, яны дапамагаюць засвоіць тэорыю, па-другое — прывучаюць да самастойнасці, бо ў навуцы без гэтага нельга.

...Ён круціў ручкі прыбора, які ўсё не хацеў настройвацца. Нарэшце з палёгкай уздыхнуў: запрацаваў-такі.

Знаёмімся. Леанід Зянько. Тэма сённяшняй работы: «Вызначэнне каэфіцыента актыўнасці метадам ЭДС».

— Бачыце, не ўлічыў некаторых акалічнасцей, і прыходзіцца крыху перарабліваць. Мінут за 30 зраблю, бо разлікі правільныя, ды і тэорыю я ўжо здаў. Галоўнае — ведаць, у чым памылка і як яе выправіць.

Леанід зноў заняўся прыборам, а я назіраю, як працуюць астатнія.

Адны заняты з колбамі і прыборамі, другія нешта падлічваюць і засяроджана пішуць.

— А ведаеце, — Леанід на хвілінку адарваўся ад сваёй справы, — чым прыцягвае мяне такая работа? Дакладнасцю. Прыборы дазваляюць весці разлікі да дзесяцітысячных.

Галіна Андрэеўна ў гэты час прымае тэорыю ў Валерыя Самсонава. Адказвае ён упэўнена, цягнецца з-пад пяра бясконцы ланцужок формул.

Валерый атрымлівае залік і новае заданне.

Заняткі працягваюцца...

Успамінаюцца словы Аляксандра Яфімава: «Такую работу нельга не любіць, бо яна якраз для хлопцаў». Так, прыемна ўсведамляць, што цябе слухаюцца разумныя прыборы, і ўсё рабіць самастойна.

**Л. ПЕРАСЫПКІНА.**

НА УНІВЕРСІТЭЦКІМ злёце студэнтаў-выдатнікаў мне пашчаслівіла слухаць многіх нашых лепшых студэнтаў. Гаварылі аб надзённых справах, аб заўтрашніх клопатах, кранalі некаторыя праблемы студэнцкага жыцця. Асабліва шмат гаварылася аб грамадскай рабоце нашых выдатнікаў. Гаварылі ў большасці выпадкаў у адным напрамку: «нам патрэбна», «мы павінны», «сучасны спецыяліст з вышэйшай адукацыяй павінен быць...» і г. д. Характарыстык і пажаданняў — хоць адбаўляй, а больш-менш слушнага падыходу да закранутай праблемы грамадска-палітычнай работы прыкмеціць так і не давялося.

# І ВЫДАТНІК, І АКТЫВІСТ

Што ж датычыць вучобы, то тут ёсць нявырашанае пытанне. Выдатным спецыялістам павінен стаць не толькі цяперашні студэнт-выдатнік, але і студэнт наогул. Як жа наладзіць кантакт з сярэднім студэнтам? Відаць, ёсць такія формы ўзаемапагадненняў паміж выдатнікамі і астатняй масай студэнтаў, якія пры адпаведных намаганнях дазволяць зрушыць «сярэдняга» студэнта на шлях больш інтэнсіўнага засваення універсітэцкіх навук.

Аб гэтых і некаторых іншых аспектах праблемы я папрасіў выказаць меркаванне студэнта-выдатніка факультэта журналістыкі Мікалая Станкевіча.

— На маю думку, у грамадскай рабоце не варта распыляцца, што часта бывае. Студэнт павінен выконваць грамадскую работу, а не плысці па яе цячэнню. Задача камітэтаў камсамола факультэтаў, камсоргаў груп — выпрацаваць строгую сістэму. Работа камсамольца павінна кантралявацца актывам і адыгрываць функцыю актывізацыі, станаўлення студэнта-выдатніка ў шырокім разуменні гэтага слова. Што гэта значыць? Сучасны студэнт універсітэта павінен стаць не толькі выдатным спецыялістам, але быць і актыўным носьбітам камуністычнай маралі, грамадскім дзеячом. Адным словам, праблема актывізацыі грамадскай работы патрабуе неадкладнай увагі і распрацоўкі. Задача выдатнікаў — узначаліць яе.

Што ж датычыць вучобы, то Мікалай Станкевіч не без гумару заўважыў:

— На ўсё патрэбна мець сістэму, — і тут жа, апярэджваючы пытанне, дадаў: — Праўда, не ў тым сэнсе, у якім разумеў яе адзін з тургенеўскіх герояў, — «не мець ніякай сістэмы — гэта таксама сістэма».

— На мой погляд, студэнт, асабліва гуманітарных факультэтаў, павінен больш працаваць самастойна. На асабістым вопыце пераканаўся, што больш глыбокія веды ў той галіне, у якой працаваў ці нават даследаваў сам. Гэта і рэфераты, і курсавыя, і першакрыніцы, і нарэшце СНТ. На маю думку, наогул перавага за большай самастойнасцю ў вучэбным працэсе. Гэта развівае ўменне аналізаваць, думаць, павышае інтэлект.

**Г. ЧЫГІР.**







*ШТРЫХІ ДА ПАРТРЭТА*

# АЛЕ І ТВАРЫЦЬ

З ім я пазнаёмілася на злёце выдатнікаў. Невысокі чарнявы юнак. Уважлівы позірк, рухавы поступ. Анатоль Бержанін — студэнт IV курса юрыдычнага факультэта. У руках у хлопца некалькі часопісаў. Цікаўлюся, для якой патрэбы?

— Гэта нямецкія часопісы, — адказвае Анатоль, — трэба пачытаць.

І потым дадае:

— Загадчыку ідэалагічнага сектара факультэцкага камітэта камсамола трэба шмат ведаць.

Нямецкай мовай і літаратурай юнак цікавіцца даўно. Паспяхова здаў дзяржаўны экзамен, а зараз займаецца самастойна.

Разгаварыліся. У маёй памяці яшчэ не сцёрліся словы адной з маіх сакурсніц, якая на ўсе мае довады і заўвагі нязменна паўтарала, што «выдатнік... зубрыла!» Вядома, нешта давала ёй падставы так гаварыць, бо ёсць яшчэ сярод выдатнікаў і такія. Галоўнае для іх — праграма курса. Часам гэтакі вось «выдатнік» нават жыцця навакольнага не заўважае. Не дзіва, што і веды ў яго атрымліваюцца фармальныя. Прымяніць жа іх да жыцця, да аналізу падзей ён не можа. Не ўласціва такому студэнту імкненне разабрацца ва ўсім самому.

Я падзялілася сваімі думкамі наконт выдатнікаў з Анатолем. Ён горача падтрымаў маё меркаванне і дадаў:

— Мне ўспамінаюцца словы В. Р. Бялінскага: «Чалавек павінен не толькі вучыць, але і тварыць...»

Сапраўды, хіба наша галоўная задача вучыць? Аддача нейкая павінна быць абавязкова. Яна можа праяўляцца ў самых розных напрамках: ці то ў грамадскім жыцці, ці ў навуковай працы, ці то проста ў парадах, дапамозе сваім сябрам. Толькі такога студэнта можна лічыць сапраўдным выдатнікам.

**Т. ФІЛІМОНАВА.**





*МАЛЫ ПРАКТЫКУМ ПА ВЫШЭЙШЫХ РАСЛІНАХ У СТУДЭНТАЎ ДРУГОГА КУРСА БІЯЛАГІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА.*

*Заняткі вядзе асістэнт кафедры сістэматыкі раслін Н. К. КУДРАШОВА.*

Фота Д. Чаховіча.

*ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ*

# ПАРТГРУПА КАФЕДРЫ

ПАРТЫЙНАЯ ГРУПА адыгрывае вялікую ролю ў жыцці любой кафедры універсітэта. Яна дапамагае загадчыкам кафедр мабілізаваць камуністаў, камсамольцаў і ўсіх супрацоўнікаў на паспяховае выкананне задач навучання і выхавання студэнтаў, а таксама навукова-даследчай работы. Акрамя таго, яна праводзіць вялікую выхаваўчую работу сярод супрацоўнікаў.

Галоўная задача партгрупы на сучасным этапе — гэта практычнае ажыццяўленне рашэнняў XXIV з'езда КПСС.

Поспех работы групы залежыць ад правільнай арганізацыі ўнутрыпартыйнай работы, якая ахоплівае цэлы шэраг пытанняў: падрыхтоўка і рэгулярнае правядзенне партыйных сходаў, актыўнасць камуністаў пры абмеркаванні пастаўленых пытанняў, састаўленне павесткі дня сходу, выбар дакладчыка, здольнага зрабіць правільны аналіз становішча спраў і паставіць канкрэтныя задачы перад камуністамі, а калі гэты сход адкрыты, і перад усімі супрацоўнікамі кафедры. Спынімся на прыкладзе правядзення сходаў у партгрупе на кафедрах фізічнай оптыкі і спектральнага аналізу.

Падрыхтоўка і правядзенне партыйнага сходу ў партгрупе ўказаных кафедр праходзіць у цесным узаемадзеянні з кіраўнікамі калектываў. Па-першае, прадумана падбіраецца павестка дня, якая павінна быць актуальнай, затым вырашаецца пытанне аб дакладчыку, ад якога залежыць актыўнасць сходу і яго дзейснасць, вызначаецца час правядзення сходу і яго форма (закрыты ці адкрыты).

Па-другое, важным элементам з'яўляецца падрыхтоўка камуністаў да гэтага сходу, своечасовае апавяшчэнне аб тэрміне і месцы правядзення, клопат аб актыўным абмеркаванні наспеўшых пытанняў. Усё гэта вельмі важна для таго, каб сходы праходзілі актыўна і на высокім арганізацыйным узроўні.

Самым галоўным, на наш погляд, у рабоце партыйнай групы з'яўляецца кантроль за выкананнем прынятых на сходах рашэнняў. Групарторг і яго намеснік абавязаны сачыць за ходам іх выканання, весці ўлік усіх праводзімых мерапрыемстваў, даваць камуністам партыйныя даручэнні, клапаціцца аб тым, каб камуністы кафедры займалі авангардную ролю ў жыцці кафедры.

Правільная арганізацыя ўнутрыпартыйнай работы, старанная падрыхтоўка, своечасовае і рэгулярнае правядзенне партыйных сходаў у групе заўсёды даюць добры практычны вынік у дзейнасці кафедры.

Так, адной з галоўных задач партыйная група кафедры фізічнай оптыкі лічыць павышэнне актыўнасці і адказнасці кожнага камуніста за даручаны яму ўчастак работы, умацаванне працоўнай дысцыпліны. У кастрычніку 1971 года гэтае пытанне абмяркоўвалася на адкрытым партыйным сходзе, з дакладам выступіў камуніст А. І. Серафімовіч. Гэты сход аказаў станоўчае ўздзеянне на ўсіх супрацоўнікаў кафедры.

Заўсёды ў цэнтры ўвагі партыйнай групы пытанні палітычнага выхавання супрацоўнікаў. У лютым стану палітыка-выхаваўчай работы на кафедры і задачам па яе паляпшэнню быў прысвечан адкрыты партыйны сход. У дакладзе быў дадзен падрабязны аналіз выхаваўчай работы і недахопаў. На сходзе прысутнічалі сакратар партбюро фізфака А. І. Камяк і член партбюро М. В. Прылепка. Сход прайшоў арганізавана, з крытычнымі выступленнямі.

Павінен адзначыць, што лепшымі сталі адносіны да філасофскіх семінараў, палепшылася іх наведванне. Было прынята рашэнне перыядычна арганізоўваць лекцыі для супрацоўнікаў.

І ў сакавіку была арганізавана адна з такіх лекцый на тэму «Моладзь і сучасная ідэалагічная барацьба».

Партыйная група абмяркоўвае ўсе наспеўшыя пытанні кафедры, раіцца з камуністамі, з камсамольцамі, усімі супрацоўнікамі, як лепш рашаць задачы, якія стаяць перад кафедрай. Так, у верасні 1971 года абмяркоўвалася на партыйным сходзе пытанне «Задачы камуністаў партгрупы па падрыхтоўцы да новага навучальнага года» (дакладчык камуніст А. В. Чалей). У кастрычніку — «Задачы камуністаў партгрупы па падрыхтоўцы да 50-годдзя БДУ» (дакладчык А. І. Серафімовіч). У сакавіку 1972 года адбыўся адкрыты партыйны сход кафедры па пытанню «Аб прыняцці сацыялістычных абавязацельстваў у гонар 50-годдзя ўтварэння СССР».

Партыйная група займаецца і работай камсамольскай арганізацыі кафедры, дапамагае ў планаванні работы, падрыхтоўцы і правядзенні камсамольскіх сходаў, пасяджэнняў бюро, Ленінскіх залікаў, арганізацыі лекцыйнай прапаганды сярод моладзі. На ўсіх камсамольскіх сходах абавязкова прысутнічаюць адзін — два камуністы партгрупы. Гэта аказвае практычную дапамогу камсамольскаму бюро ў правільным рашэнні наспеўшых пытанняў.

Такая арганізацыя работы мабілізуе камуністаў, камсамольцаў і ўсіх супрацоўнікаў кафедры на рашэнне агульных задач, якія стаяць перад кафедрай.

*А. МАЛАЛЕТКІН, групарторг кафедры фізічнай оптыкі.*

# У МАТЭМАТЫКАЎ СВЯТА



*Госці матфака—студэнты пяці універсітэтаў.*



*Сакратар камітэта камсамола матфака В. Балашчанка гутарыць з гасцямі ў актавай зале.*



*Падпісанне дагавору аб дружбе і ўзаемадапамозе паміж дэканатам і першакурснікамі.*

Фота У. Кана.

28—30 красавіка ўрачыста адзначаліся дні матэматычнага факультэта. Ужо 27 красавіка да нас прыехалі госці з блізкіх па роду факультэтаў пяці універсітэтаў краіны—Львоўскага, Харкаўскага, Кішынёўскага, Днепрапятроўскага і Гомельскага. Вечарам таго ж дня камітэт камсамола разам з камандай КВЗ нямала папрацавалі над афармленнем факультэта—паявіліся «вуліцы» і «плошчы», новыя дарожныя знакі, аб'явы, каментарыі, рэкламы, карцінкі матэматычнага звярынца. Была вывешана падборка «Мясцовай і глабальнай хронікі» з газеты «РЛЗ». Творчасць энтузіястаў прыйшлася да густу не толькі матэматыкам, але і студэнтам іншых факультэтаў: на чацвёртым паверсе адразу стала мнагалюдна.

Раніцай 28-га адбыўся «матч года»—першая ў гісторыі сустрэча па футболу паміж выкладчыкамі і студэнтамі. Лік—2:2. На першай мінуце студэнты не забілі пенальці (біў студэнт з групы выкладчыка, які стаяў на варотах). Выкладчыкі забілі гол нагой, студэнты ж—адзін нагой, а другі—галавой (і яшчэ адзін у свае вароты). Ад вывадаў устрымаюся.

29 красавіка — кульмінацыйны дзень свята. У 10 гадзін 15 хвілін у аўдыторыі геафака пачалася прэс-канферэнцыя нефармальнага тыпу — пісьмова можна было задаць любое пытанне любому выкладчыку. Адкрылі яе студэнты IV курса, прачытаўшы даклад «Уводзіны ў матфак». Усё далейшае паказала, што і сярод выкладчыкаў і сярод студэнтаў нямала людзей, валодаючых развітым пачуццём гумару. Пытанні студэнтаў па каварству не ўступалі пытанням выкладчыкаў на экзаменах, а маналогі выкладчыкаў былі дастойны адказаў студэнтаў на тых жа экзаменах. «Барацьба тытанаў»—так пракаменціраваў гэтую падзею вечны студэнт нашага факультэта П. Шышкін.

Вечарам у 18.30—урачыстае адкрыццё, пасвячэнне першакурснікаў у студэнты і канцэрт. З прывітальным словам выступіў дэкан факультэта А. А. Гусак, прагучалі цёплыя віншаванні гасцей.

Пачынаецца пасвячэнне. Гасне святло. У сярэдзіне залы ўтвараецца «жывы калідор», асветлены свечкамі. Адчыняюцца дзверы, і чацвёра служыцеляў матэматыкі ўносяць Піфагора. Павольна ідзе працэсія, плыве таямнічая мелодыя. Узышоўшы на сцэну, Піфагор вымаўляе словы ўрачыстай клятвы. Услед за ім клянецца ўся зала. Але вось цырымонія закончана. Піфагор знікае, і пачынаецца канцэрт, па традыцыі зроблены ў форме пазачарговага выпуску газеты «Рошым любую задачу».

На сцэне — таленты матфака. Гучаць песні, апавяданні, мініяцюры, і, як заўсёды, чарговыя прэм'еры паказвае каманда КВЗ.

Вечар вянчае падпісанне дагавору аб дружбе і ўзаемадапамозе паміж дэканатам і першакурснікамі.

Раніцай 30 красавіка адбыўся абмен вопытам камсамольскай работы з нашымі гасцямі.

Так прайшлі дні нашага факультэта. У нас паявілася яшчэ адно цудоўнае свята.

**А. МАРЦІНКОЎСКІ.**

Народны КАНТРОЛЬ

# ГНК У ДАЗОРЫ

Самыя разнастайныя і актуальныя пытанні хвалююць народных кантралёраў геаграфічнага факультэта. Наведванне студэнтамі лекцый, іх паспяховасць, быт, адпачынак — усё гэта знаходзіць належнае месца ў іх рабоце. За апошні час яны праверылі, як размяркоўваецца вучэбная нагрузка выкладчыкаў, наколькі выніковыя навуковыя даследаванні на факультэце, гатоўнасць кабінетаў да сесіі і многае іншае.

Усю сваю дзейнасць група народнага кантролю разгортвае па плану. Праўда, бываюць і невялікія адступленні. Напрыклад, рэзка пагоршылася наведванне лекцый — рэйд, і вынікі відавочныя.

Планы групы народнага кантролю, як правіла, узгадняюцца з дэканатам і грамадскімі арганізацыямі, якія часта дапамагаюць і выконваць іх: своечасова рэагуюць на заўвагі кантралёраў, праводзяць сумесныя рэйды, праверкі і г. д.

Нярэдка ў групу народнага кантролю звяртаюцца студэнты, выкладчыкі. Адчуваючы зацікаўленасць з боку кантралёраў, яны просяць дапамогі, парады або падказваюць самі, як вырашыць тую ці іншую грамадскую праблему.

Але вось сувязь ГНК факультэта з «Камсамольскім пражэктарам» не вельмі цесная, хоць ён павінен быць першым памочнікам у рабоце. На жаль, такога імкнення з боку пражэктарыстаў пакуль што няма. Некаторыя нумары «КП» выходзілі са спазненнем, не заўсёды рэагавалі члены штаба «КП» і на парушэнні грамадскага парадку. Тут трэба пажадаць «Камсамольскаму пражэктару» больш актыўнага супрацоўніцтва з ГНК.

Хацелася б адзначыць плённую работу кіраўніка ГНК факультэта Дзмітрыя Міхайлавіча Каруліна. Многае карыснае, што зроблена на факультэце, залежала ад гэтага неспакойнага чалавека, добрасумленнага, з невычэрпнай энергіяй і вострым пачуццём адказнасці за калектыўную справу.

М. БАГРЫЙ-ШАХМАТАВА,
член ГНК універсітэта.

# КОРЖЫК... З ЯБЛЫЧНЫМ СОКАМ

Работа буфета філалагічнага факультэта ад сталовай № 33 выклікала і працягвае выклікаць многа нараканняў і скарг з боку студэнтаў і супрацоўнікаў факультэта. Вельмі бедны асартымент страў. Часта не хапае малака, розных булачак, не заўсёды ёсць кефір. Затое пастаянна ў меню набіўшыя аскоміну гароднінная салянка, нясвежыя і халодныя катлеты. Да таго ж, чэрствыя булачкі і коржыкі заўсёды прыходзіцца запіваць... яблычным сокам або мінеральнай вадой.

Часта выходзіць са строю электрапліта, таму кава або чай бываюць ледзь цёплымі. Раніцамі, на стыку змен буфетчыц, нярэдка даводзіцца задавальняцца халоднымі (з халадзільніка!) трэцімі стравамі. Не заўсёды свежымі бываюць і завозімыя прадукты.

Адміністрацыйна-гаспадарчая частка універсітэта недаравальна зацягвае рамонт буфета. Абяцаюць правесці яго толькі летам. А ў буфеце ж харчуюцца штодзённа да пяцісот чалавек!

У апошні час, пасля неаднаразовых праверак і замен буфетчыц, стала крыху чысцей у буфеце. Аднак пры пастаяннай цеснаце немагчыма забяспечыць там нармальныя санітарна-гігіенічныя ўмовы і добрую работу.

І яшчэ адна заўвага. Варта было б у корпусе на трэцім і чацвёртым паверхах арганізаваць продаж піражкоў і свежых булачак.

**Я. КАМАРОЎСКІ,**
**дацэнт, старшыня жыллёва-бытавой камісіі прафбюро,**
**ПАЛЯКОЎ,**
**БАРЫСАВА,**
**БАНЬ,**
**студэнты.**

# УКРАІНА, ЦВЕЦЕ ЛЮБЫ, СОНЦАМ ГАДАВАНЫ...

СССР 50

Словы гэтыя належаць нашаму народнаму паэту Янку Купалу. У іх — і любоў беларусаў да сваёй паўднёвай суседкі, роднай сястры, і замілаванне ёю, і гордасць за яе. З Украінай, як і з Расіяй, беларусы звязаны векавечнай дружбай, крэўнасцю. Карэнні яе—пад пластамі вякоў, у Кіеўскай Русі, у адзінстве жыццёвага лёсу беларусаў і украінцаў у час знаходжання ў Вялікім княстве літоўскім. Працяг—у атрадах змагароў за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне, на барыкадах рэвалюцый 1905-га, Лютаўскай і асабліва Кастрычніцкай 1917-га гадоў.

Перадумова і адзін з самых дзейсных чыннікаў дружбы народаў—узаемасувязі іх культур, літаратур. Распачыналіся яны, беларуска-украінскія літаратурныя сувязі, яшчэ задоўга да таго, як Тарасу Шаўчэнку давялося прайсці гаротнымі сцяжынамі абяздоленай Беларусі, а беларусу Францішку Багушэвічу — атрымаць юрыдычную адукацыю ва ўкраінскім горадзе Нежыне. Аднак толькі пасля Вялікага Кастрычніка, які даў Украіне і Беларусі сваю дзяржаўнасць, права на свабоднае развіццё нацыянальных культур, пачаўся сапраўдны працэс іх узаемадзеяння, узаемнага ўзбагачэння, У Беларусь паўнамоцнымі прадстаўнікамі сястры-суседкі прыйшлі творы Т. Шаўчэнкі, І. Франка, Л. Украінкі, П. Тычыны, М. Рыльскага, Ул. Сасюры, М. Нагнібяды, А. Юшчанкі і іншых украінскіх пісьменнікаў. У сваю чаргу вершы, паэмы, раманы Ф. Багушэвіча, М. Багдановіча, Я. Купалы, Я. Коласа, П. Броўкі, М. Танка, І. Мележа, І. Шамякіна, В. Быкава (ды хіба ўсіх пералічыш!) украінцы могуць сёння чытаць і на роднай мове. Калі гаварыць толькі пра паэзію, то адно за апошнія тры гады ў перакладзе на украінскую мову выйшлі ў свет «Вянок» М. Багдановіча (у пера-выдадзеных перакладах М. Драй-Хмары) і кніга лірыкі гэтага чароўнага майстра паэтычнага слова (у серыі «Жамчужыны сусветнай лірыкі»), кнігі вершаў Янкі Купалы, «Мой хлеб надзённы» М. Танка (пераклаў М. Нагнібяда) і інш. Асабліва хочацца вылучыць два выданні. Гэта — анталогію маладой беларускай паэзіі «Калінавыя масты» і двухтомную анталогію беларускай савецкай паэзіі. У «Калінавых мастах» прадстаўлены паэты, што актыўна заявілі пра сябе галоўным чынам з другой паловы 50-х гг., літаратары, якія ўжо маюць даволі важкі творчы багаж, і тыя, хто толькі што выдаў свае першыя кніжкі,—усяго сорак тры чалавекі. Сярод іх—Н. Гілевіч, А. Лойка, С. Гаўрусёў, П. Макаль, якіх хіба што ўмоўна можна лічыць маладымі, а, з другога боку, М. Дукса, М. Федзюковіч, В. Іпатава, Ю. Голуб, Я. Янішчыц, А. Разанаў—нядаўнія студэнты (пераважна нашага універсітэта). Двухтомная анталогія беларускай паэзіі — своеасаблівая хрэстаматыя лепшых узораў беларускай паэзіі на ўкраінскай мове. Падобнае выданне ажыццёўлена за межамі Беларусі ўпершыню. Па аб'ёму, колькасці твораў і прадстаўленых аўтараў яму пакуль што няма роўных. Выданне такой анталогіі запатрабавала сапраўды тытанічных намаганняў вялікага перакладчыцкага калектыву, работнікаў рэдакцый і выдавецтва. Яно стала магчымым толькі дзякуючы праробленаму ранейшымі перакладчыкамі з беларускай мовы, сярод якіх бачым М. Рыльскага, П. Тычыну, А. Малышку і іншых.

У гэтыя вясновыя дні група стваральнікаў анталогіі прыехала ў Мінск. Гасцямі беларускай сталіцы, а таксама і нашага універсітэта сталі галоўны рэдактар выдання М. Нагнібяда, вядомыя ўкраінскія паэты і перакладчыкі М. Упенік, А. Юшчанка, Б. Сцепанюк, М. Сынгаеўскі, Б. Алейнік, І. Драч. Сёння на філалагічным факультэце адбудзецца вечар дружбы беларускай і ўкраінскай літаратур. Безумоўна, ён з'явіцца яшчэ адным яскравым сведчаннем непарушнага брацкага яднання савецкіх народаў і іх літаратур, жыццёвасці ленінскай нацыянальнай палітыкі.

Ніжэй мы змяшчаем некалькі вершаў украінскіх паэтаў у новых перакладах дацэнта кафедры беларускай літаратуры В. П. Рагойшы.

*Васіль СІМАНЕНКА*

## ПРАРОЦТВА 17 ГОДА

Гранітныя надгроб'і, як мядузы,
Паўзлі, паўзлі і выбіліся з сіл—
На цвінтары панішчаных ілюзій
Не стала болей месца для магіл.
Мільярды вер закопаны ў чарнозем,
Мільярды шчасцяў—толькі тлен і прах.
Душа гарыць. Палае люты розум.
Рагоча з ім нянавісць на вятрах.
Калі б абдураныя прасвятлелі,
Калі б забітыя ўсе ажылі,—
Нябёсы, куды скаргі ўсе ляцелі,
Не вытрымалі б, трэснулі б, здалі б.
Трасіцеся ж, забойцы, лізаблюды!
Жыццю не мерка болей ваш капыл.
Вы чуеце? На цвінтары ілюзій
Ужо не стала месца для магіл.
Ужо народ—адна балючка-рана,
І ад крыві раз'ятрана зямля,
На ката і на кожнага тырана
Ссукана ўжо надзейная пятля.
Ашуканыя, збітыя, забітыя
Ужо ўстаюць чыніць свой правы суд,
І, злыя, горкія, несамавітыя,
Праклёны іх спадуць на душы сытыя,
І гайдануць асіны на дасвецці
Апосталаў злачынства, злых прыблуд!
І ўстануць праўда і любоў на свеце,
На варце ж праўды стане працы люд!

***

Дзе сёння вы, майго народу каты?
Дзе сіла ваша, веліч ваша дзе?
На зоры і на воды, і на хаты
Больш ваша злосць сляпая не спадзе.
Народ расце, і множыцца, і дзее
Без вашых бізуноў і палаша.
Пад сонцам вечнасці цвіце і маладзее
Яго лагодная і жорсткая душа.
Народ мой ёсць! Заўжды народ мой будзе!
Ніхто не перакрэсліць мой народ!
А кожнаму пярэхрысцю й прыблудзе
Наканаваны лёс фашысцкіх орд!
Вы, катаў байструкі, цяпер бяссілых,
Не забывайце, вырадкі, нідзе:
Народ мой ёсць! Ў яго гарачых жылах
Кроў казакоў пульсуе і гудзе!

*Іван ДРАЧ*

## БАЛАДА ПРА ВЯДРО

Я—форма бляшаная. Мой жа змест—вішні,
Агнёва-барвовыя пыльныя кулі,
Што раніцай зоры пілі на узвышшы,
Сарваныя ж—покатам потым паснулі.
Я—форма бляшаная. Мой жа змест—грушы,
Суперніцы сонца, свяцільнікі саду,
З рэспублікі сокаў вандроўныя душы,
Якіх падабралі ў ноч грушападу.
Я—зрэзаны конус. А змест мой да скону—
Усё незалежнае, што умяшчаю:
Дыні ці дулі, ці промень зялёны
Цыбулі, ці лісце пахучае чаю.
Я—форма бляшаная. Мой жа змест розны,
Не мне падуладны, а часу, патрэбам.
Калі ж я часамі бываю парожнім,
Тады я па вечка напоўнена небам.

## ЭЦЮД — КОПІЯ ЗАПІСКІ

Не спалохалася дажджу,
Падаткнула спадніčку новую
І чакала цябе з бярозкамі,
Хочаш вер, а хочаш не вер.
Запляла ў русу косу вясёлку,
А цябе не сварыла ні крышку,
Толькі кропельку, так, для прыліку,
Хочаш вер, а хочаш не вер.
Мама кажа, што я застудзілася,
І вось чай п'ю цяпер я з сонцам
І выглядваю ўсё у вакно,
Хочаш вер, а хочаш не вер.
Я дастала табе Рэмбо.
Тата ўчора прынёс кавуноў,
І ўжо сцежка да нас прасохла.
Хочаш вер...
Ну, хоць раз павер!..

## ВЯЧЭРНЯЯ АКВАРЭЛЬ

Сядзіць хлопчык на пагорку,
Пасе вечар на руні,
Зоркі пужкаю збівае, насвіствае.
А вечар пасецца, хвастом памахвае.
Ідзе маё золатка, прытанцоўвае,
Нясе мне поўныя неразлітыя вусны,
Нясе мне поўныя неразлітыя персі,
Нясе вішнёвае цела дзявочае
У шоўкавым келіху сіняй сукенкі,
Спяшаецца маё золатка наўздагон свайму сэрцу.

Гэй ты, хлопчык на пагорку,
А прыцёхні ты пужкаю,
Каб не бавілася маё золатка!

## ● ПРЭМ'ЕРА СТУДЭНЦКАГА ТЭАТРА

З вялікім поспехам прайшоў падрыхтаваны артыстамі-аматарамі пад кіраўніцтвам заслужанага артыста Латвійскай ССР А. М. Озерава спектакль «Адны, без анёлаў».



*Валерыя (Н. Пякарская, студэнтка II курса філфака).*



*Галя (Л. Дубікава) і Косця (А. Зартайскі).*

*Фота В. ЖУКА.*

# СЯБРОЎСКІ МАТЧ

У дні майскіх свят на універсітэцкім стадыёне адбылася незвычайная таварыская сустрэча па футболу: сустрэліся каманды замежных студэнтаў асноўнага і падрыхтоўчага факультэтаў.

Гульня праходзіла зладжана і захапляюча. Каманду асноўнага факультэта ўзначалілі студэнты з В'етнама і Балгарыі. У састаў каманды падрыхтоўчага факультэта ўвайшлі студэнты з Алжыра, В'етнама, Конга, Кубы, Сьера-Леоне.

У першым тайме перавага была на баку старшакурснікаў. Але дзякуючы ўмеламу валоданню мячом, каманда падрыхтоўчага факультэта аказвала мужнае супраціўленне. І толькі на 37-й мінуце гаспадарам поля ўдалося забіць адзіны гол у вароты праціўніка.

У другім тайме барацьба была больш напружанай. У першыя мінуты гаспадары поля зноў забілі гол. На 15-й мінуце нападаючы Гатсона Базіль (падрыхтоўчы факультэт) з 11-метровай адзнакі паслаў мяч у сетку сапернікаў. Лік стаў 2:1.

У канцы матча каманда асноўнага факультэта зноў дабілася поспеху, забіўшы трэці гол. Такім чынам сустрэча закончылася з лікам 3:1 на карысць больш трэніраваных гаспадароў поля.

**У. ЛАПАЦІН,**
**суддзя матча.**

*НА ЗДЫМКУ: члены каманды-пераможцы — замежныя студэнты асноўных факультэтаў.*

*Фота У. БУДАЯ.*



# СПРАВА КОЖНАГА З НАС

## ЛІСТОК ДАІ

*Вось і прыйшла вясна. Прыгрэла сонейка. Аматары прыроды бяруць кірунак за горад на матацыклах, у «Жыгулях», «Масквічах», «Запарожцах», у грамадскім транспарце. Абнавіць вясенні шлях выехалі веласіпедысты.*

*Вясна прынесла з сабой не толькі радасць абуджэння прыроды, прывабнасць загарадных паездак, яна павялічыла інтэнсіўнасць транспартнага і пешаходнага руху.., і колькасць парушэнняў правіл руху на вуліцах нашага горада. Пераканаўчым доказам гэтага служаць лічбы ДАІ за красавік. У мінулым месяцы за няправільны пераход вуліцы было аштрафавана больш 500 жыхароў сталіцы. У тым ліку 18 парушальнікаў-пешаходаў павінен аднесці на свой рахунак політэхнічны інстытут, 11—універсітэт, 2—медыцынскі інстытут.*

*На вуліцах горада мглі месяца 87 дарожна-транспартных здарэнняў, у выніку якіх загінулі 5 чалавек і каля 100 атрымалі цяжкія траўмы.*

*Як бачыце, становішча спраў на дарогах у вясеннюю пару прымушае насцеражыцца.*

*У сувязі з гэтым З 15 МАЯ ПА 15 ЧЭРВЕНЯ ПА ЎСЁЙ КРАІНЕ ПРАВОДЗІЦЦА МЕСЯЧНІК ПА БЯСПЕЦЫ ДАРОЖНАГА РУХУ.*

*Паніжэнне аварыйнасці на нашых дарогах — справа не толькі адной дзяржаўтаінспекцыі. У ёй павінны быць зацікаўлены калектывы прадпрыемстваў, вучэбных устаноў, грамадскіх арганізацый. Па гэтаму пытанню неабходна правесці сходы з вадзіцельскім саставам транспартных цэхаў, гаражоў. Мэтазгодна было б уключыць гэтае пытанне ў павестку партыйных і камсамольскіх сходаў, дзе былі б намечаны канкрэтныя мерапрыемствы па забеспячэнню бяспекі руху транспарту і пешаходаў. З мэтай паляпшэння тэхнічнага стану транспарту нядрэнна было б арганізаваць яго праверку перад выхадам на лінію і пасля вяртання ў гараж. У вытворчых і вучэбных калектывах неабходна праводзіць мерапрыемствы па вывучэнню правіл бяспекі руху.*

*Толькі падтрыманне ўсіх гэтых патрабаванняў дасць магчымасць дабіцца высокіх вынікаў у правядзенні месячніка бяспекі руху.*

*Таварышы! Уключайцеся ў актыўную работу па наведзенню ўзорнага парадку ў руху транспарту і пешаходаў!*

*І. ХУДЗЕЕЎ,*
*палкоўнік міліцыі, начальнік ДАІ УУС Мінгарвыканкома.*

АТ 02715
Зак. 571.
Наш адрас: Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Тэлефон — 22-07-19.
Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ. Тыраж 2 000 экз.
Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.